# А.А. ІОФЕ І Я. ДОМБСКІ: СУПРАЦЬСТАЯННЕ АСОБ І СІСТЭМ У РАМКАХ РЫЖСКАЙ МІРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ (ВЕРАСЕНЬ 1920 г. – САКАВІК 1921 г.)

В.М. Бароўская (Мінск)

Супрацьстаянне Абрама Адольфавіча Іофе і Яна Домбскага можна яскрава заўважыць падчас неафіцыйных сустрэч, якія праходзілі ў рамках Рыжскай мірнай канферэнцыі (верасень 1920 г. – сакавік 1921 г.). Адзначаныя сустрэчы праходзілі часцей ў вечары, у іх прымалі ўдзел, акрамя старшынь абедзвюх дэлегацый, яшчэ і сакратары. Журналісты і іншыя члены дыпламатычнага корпуса да тайных перагавораў не былі дапушчаны. Для найлепшай камунікацыі паміж удзельнікамі, было вырашана, што мовай перагавораў стане нямецкая. Зразумела, што карыстацца паслугамі перакладчыкаў лічылася немагчымай справай. Такім чынам, удзельнікамі неафіцыйных сустрэч былі: Абрам Адольфавіч Іофэ, старшыня расійска-ўкраінскай мірнай дэлегацыі, супрацоўнік Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР; Іван Леанідавіч Лорэнц, сакратар дэлегацыі; Ян Домбскі, старшыня польскай мірнай дэлегацыі, віцэ-міністр замежных спраў Польшчы; Аляксандр Ладась, сакратар польскай дэлегацыі. Тайныя перагаворы праходзілі ў палацы Чорнагаловых у Рызе, дзе і большасць пасяджэнняў мірнай канферэнцыі.

У рамках першага этапу рыжскіх савецка-польскіх перагавораў (21 верасня – 12 кастрычніка 1920 г.) адбылося чатыры сустрэчы. Першая з іх адбылася адбылася 1 кастрычніка 1920 г. Неабходнасць пераходу з формы пленарных афіцыйных пасяджэнняў, з прысутнасцю журналістаў, спецыялістаў, міжнародных назіральнікаў, да сакрэтных, “тайных” перагавораў паміж абодвума старшынямі дэлегацый у суправаджэнні сакратароў, выявілася ў сувязі з узнікненнем пэўнага замяшання ў шэрагах польскай мірнай дэлегацыі, пасля агучвання на сёмым (першым) пасяджэнні 24 верасня 1920 г. “Звароту УЦВК” [1, s. 105–106]. Ініцыятыва ў наладжванні тайных сустрэч належала расійска-ўкраінскаму боку, які імкнуўся паскорыць агульны ход мірных перагавораў. Напярэдадні сустрэчы 1 кастрычніка 1920 г. А.А. Іофэ ў тэлеграме да Г.В. Чычэрына паведамляў аб ходзе працы мірнай канферэнцыі, адзначаючы факт стварэння рабочых камісій (камісіі па выпрацоўцы “Дагавора аб перамір’і”, фінансава-эканамічнай, тэрытарыяльнай) і агульную безвыніковасць працы і палемічны характар пасяджэнняў (“ибо у поляков зуд говорения”) [2].

Абодва бакі агучылі свае мінімальныя тэрытарыяльныя запатрабаванні: прапанова расійска-ўкраінскага боку – чыгуначная лінія Ліда – Баранавічы – Лунінец – Роўны – Броды, і адначасовая непрымальнасць польскім бокам адзначанай лініі па прычынах нязручнасці яе ў выпадку магчымага ваеннага нападзення. Старшыня расійска-ўкраінскай дэлегацыі, А. А. Іофэ неаднаразова падчас сустрэчы апеляваў да рашэння Вышэйшага Савета краін Антанты

Репозиторий ВГУ

ад 8 снежня 1919 г., зазначаючы перадачу тэрыторыі Беларусі ў сферу расійскіх уплываў. Тым самым абмяжоўваючы тэрытарыяльныя прэтэнзіі польскага боку, адзначаючы неабходнасць суаднясення ўласных рашэнняў з агульнай пазіцыяй краін Антанты, рацыянальнага абгрунтавання пэўнай усходняй мяжы Польшчы перад міжнароднай супольнасцю. Жаданне савецкага боку каардынаваць асноўныя пункты плануемага Прэлімінарнага мірнага дагавора з Польшчай вынікала з патрабання Вялікабрытаніі, выстаўленага падчас гандлёвых савецка-англійскіх перагавораў, заключыць “пачэсны мір з палякамі” [3].

Падчас сустрэчы знайшлі свае адлюстраванне апасенні савецкага боку, выказаныя ў тэлеграме А.А. Іофэ Г.В. Чычэрыну 22 верасня 1920 г. [4], ва ўзаемазалежнасці Польшчы ад французскага кіраўніцтва, і магчымым жаданні польскага боку зацягваць мірныя перагаворы з мэтай аказання такім чынам дапамогі войскам П.М. Урангеля. Аднак, Я. Домбскі, адразу запэўніў апанента ў адваротным, адзначыў самастойны характар знешняй палітыкі Польшчы і агульным жаданні заключэння хуткага міру. Адначасова расійска-ўкраінскі бок настойліва выказваўся за выкананне ўмоў савецка-літоўскага дагавора 12 ліпеня 1920 г., за перадачу Вільна і Віленскай акругі Літве, тым самым адзначаючы, што будучы Прэлімінарны мірны дагавор павінен вызначыць лінію размежавання паміж Польшчай, Расіяй, Украінай, пакідаючы вырашэння польска-літоўскіх спрэчак па-за дагаворам.

Другая сустрэча адбывалася 2 кастрычніка 1920 г. Яе асноўным зместам стала вырашэнне пытання далейшай канкрэтызацыі лініі размежавання паміж бакамі. Старшыня польскай дэлегацыі, Я. Домбскі прапанаваў расійска-ўкраінскаму боку ўжо дакладна вызначаную лінію мяжы, якая вынікала з агульнага выніку ўнутранага галасавання ў шэрагах польскай дэлегацыі. Напярэдадні, ноччу з 1 на 2 кастрычніка 1920 г., была прынята лінія размежавання, якая павінна была выглядаць наступным чынам: Збруч − Роўна – Сарны – Лунінец − на захад ад Мінска – Вілейка – Дзісна − р. Дзвіна. Галасаванне склалася наступным чынам: шэсць галасоў за прыняцце лініі размежавання без уключэння Мінска ў склад польскай дзяржавы (Н. Барліцкі, У. Кернік, С. Грабскі, А. Мечкоўскі, Л. Вашкевіч, М. Віхлінскі), тры галасы супраць (Я. Домбскі, Л. Васілеўскі, В. Камянецкі), пры адным, які ўстрымаўся ад галасавання (генерал М. Кулінскі). Згодна з сцверджаннямі С.Грабскага, такая канфігурацыя мяжы з’яўлялася кампрамісным рашэннем, якое дазваляла атрымаць тэрыторыю ў раёне Вілейкі – Дзісны і стварыць агульную польска-літоўскую мяжу і адрэзаць Савецкую Расію ад Балтыйскага мора, тэрыторыю на Валыні (гарады Камянец, Плоцк, Стараканстанцінаў), хоць і пакідала па-за лініяй мяжы Мінск і яго акругу [5, s. 235–236]. Згодна ўспамінам А. Ладася, сакратара польскай дэлегацыі, пункт гледжання Грабскага патрымалі не толькі прыхільнікі інкарпарцыянісцкай канцэпцыі, але і прадстаўнікі сацыялістычных партый (ППС), Н. Барліцкі, Ф. Перл. На

Репозиторий ВГУ

федэралісцкіх пазіцыях засталіся толькі Л. Васілеўскі і В. Камянецкі. Напрыканцы сустрэчы па ўзгодненаму рашэнню абодвух старшынь было вырашана назначыць пасяджэнне галоўнай камісіі канферэнцыі на 4 кастрычніка 1920 г.

Трэцяя сустрэча старшынь расійска-ўкраінскай і польскай дэлегацы была пазначана на 4 кастрычніка 1920 г. Яна праходзіла ў чаканні адказу з Масквы і Харкава на прапанаваную польскім бокам лінію размежавання. Было абмеркавана пытанне ўтварэння так званага "карыдору Грабскага", які аддзяляў б тэрыторыю Савецкай Беларусі, Расіі ад Літвы. Расійска-ўкраінскі бок хвалявала пытанне вольнага транзыту праз тэрыторыю карыдора для выхаду да Балтыйскага мора.

На наступны дзень, 5 кастрычніка 1920 г. адбылася чацвёртая сустрэча. На ёй было узнята пытанне вызначэння тэрміна заключэння Прэлімінарнага мірнага дагавора. Асноўнымі перашкодамі называліся непаразуменні падчас знаходжання кампраміснага рашэння фінансава-эканамічных пытанняў (вызначэнне памераў і формы плацяжу), пытання забароны ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы бакоў. Галоўным пунктам сустрэчы стала агучванне рашэння савецкага боку па прыняццю прапанаванай польскім бокам лініі размежавання, дасягненне дамоўленасці аб падпісанні Прэлімінарнага мірнага дагавора да 8 кастрычніка 1920 г.

Адразу ж пасля падпісання Прэлімінарнага мірнага дагавора, польская мірная дэлегацыя вымушана была выехаць для прадастаўлення справаздач на пасяджэнні Савета Міністраў, Міністэрству замежных спраў, кіруючым органам сваіх палітычных партый; з мэтай атрымання неабходных паўнамоцтваў для падпісання канчатковага мірнага дагавора. У Рызе застаўся толькі мінімальны персанал дэлегацыі пад кіраўніцтвам Л. Васілеўскага. Таксама ў Маскву выехала амаль цалкам расійска-ўкраінская мірная дэлегацыя, у Рызе было пакінута прадстаўніцтва на чале з паслом РСФСР у Латвіі Я.С. Ганецкім.

Першая неафіцыйная сустрэча двух старшынь мірных дэлегацый на другім этапе рыжскіх польска-савецкіх перагавораў (17 лістапада 1920 г. – 18 сакавіка 1921 г.) адбылася 29 лістапада 1920 г. А.А. Іофэ ўзняў пытанне выканання "Дадатковага пратакола расійска-ўкраінскай і польскай дэлегацый на мірных перагаворах аб адыходзе польскіх войск на тэрыторыю Польскай дзяржавы" 14 лістапада 1920 г., выказаў апасенне ў верагоднасці злучэння ваенных атрадаў С.Н. Булак-Булаховіча, С.В. Пятлюры з Л. Жылігоўскім, сумненне адносна міралюбівых жаданняў польскага боку, адзначаў факт замаруджвання прац рабочых камісій (тэрытарыяльнай, юрыдычна-палітычнай, фінансава-эканамічнай, па абмену ваеннапалонных і заложнікаў). Адначасова, узгадваючы ноту міністра замежных спраў Польшчы Я. Сапегі да народнага камісара замежных спраў Г.В. Чычэрына, 26 лістапада 1920 г., старшыня расійска-ўкраінскай мірнай дэлегацыі выказаў згоду на ўсталяванне тэрміну канчатковага заключэння міру, аднак абодва старшыні мірных дэлегацый добра разумелі, што вызначэнне тэрміну стане стрымліваючым фактарам і можа прывесці да паспешных рашэнняў. Падчас першай неафіцыйнай сустрэчы А.А.

Рэпазіторый ВДУ

Іофэ паведаміў аб атрыманні прапановы ад польскага боку ажыццявіць рэктыфікацыю мяжы, замацаванай у Прэлімінарным мірным дагаворы, выказваў пажаданне разгледзіць канкрэтныя праекты [1, s. 137–139].

Наступная сустрэча адбылася 8 снежня 1920 г. Напярэдадні польскай мірнай дэлегацыяй было прапанаваны ажыццявіць пэўныя "памежныя карэкціроўкі" (каля 10 тысяч квадратных вёрст), на што А.А. Іофэ не даў адназначнага адказу, але даў абяцанне польскі праект паведаміць савецкаму цэнтральнаму кіраўніцтву, якое разгледзіць яго на бліжэйшым з'ездзе Саветаў (VIII Усерасійскі з'езд Саветаў 22–29 снежня 1920 г.). Пазіцыя расійска-ўкраінскага боку заключалася ва ўліку эканамічнай каштоўнасці той ці іншай тэрыторыі падчас ажыццяўлення працэса рэктыфікацыі мяжы і ў залежнасці ад гэтага пэўным чынам змяніць суму эканамічных прэтэнзій польскага боку, або канчаткова ліквідаваць пытанне рээвакуацыі маёмасці жыхароў польскай нацыянальнасці [1, s. 143–144].

16 снежня 1920 г. адбылася трэцяя (у рамках другога этапу рыжскіх перагавораў) неафіцыйная сустрэча старшынь польскай і расійска-ўкраінскай дэлегацый. Галоўнай тэмай стала фінансава-эканамічная праблематыка. А.А. Іофэ абвінавачваў польскі бок ва няўступлівасці, неабгрунтаваных прэтэнзіях польскага спецыяліста Г. Страсбургера, віцэ-міністра прамысловасці і гандлю. У выніку, 12 лютага 1921 г. адбылася неафіцыйная сустрэча А.А. Іофе з Я. Домбскім, падчас якой старшыня польскай дэлегацыі даў згоду на атрыманне 30 млн. залатых рублі, але пры ўмове выплаты іх золатам. Згодна дыпламатычнай перапіскі Г.В. Чычэрына і А.А. Іофе, Савецкая Расія не валодала неабходнай колькасцю залатых запасаў, да і наогул плацёжная здольнасць расійска-ўкраінскага боку была дастаткова слабай. У выніку, перагавораў Л.Б. Красіна і Я.К. Стэчкоўскага, 21 лютага 1921 г. была дасягнута дамоўленасць аб выплаце 15 млн. залатых рублі золатам, а астатнюю частку шляхам продажу каштоўных камяннеў напрацягу 2–3 гадоў [1, s. 176–179]. Гэта дазволіла 24 лютага 1921 г. падпісаць "Дагавор аб рэпатрыяцыі", пратакол аб працягу тэрміна перамір'я (да моматну абмена ратыфікацыйных дакументаў канчатковага мірнага дагавора), дадатковы пратакол аб дзейнасці Змешанай памежнай камісіі.

Такім чынам А.А. Іофе і Я. Домбскі, нягледзячы на дастаткова прыязныя адносіны, вымушаны былі падпарадкоўваць свае дзеянні рэкамендацыям і інструкцыям, атрыманых ад знешнепалітычных ведамстваў сваіх краін, часта ўступаць у канфрантацыі, пагражаць зрывам перагавораў. Спроба згладзіць ідэалагічныя і палітычныя разыходжанні, была прадпрынята ў рамках неафіцыйных сустрэч паміж кіраўнікамі дэлегацый. Арганізацыя і правядзенне тайных сустрэч паміж страшынямі польскай і расійска-ўкраінскай дэлегацый дазволілі вырашыць шматлікія спрэчныя моманты, па якім дасягненне кампрамісу ў фармаце пасяджэнняў мірнай канферэнцыі з'яўлялася б немагчымай справай.

Рэпозиторий ВГУ

1. Dąbski, J. Pokój Ryski. Wspomnienia. Petraktacja. Tajne układy z Joffem. Listy / J. Dabski. – Warszawa, 1931. – 225 s.
2. Архив внешней политики Российской Федерации (АВП РФ). – Фонд 04. – Оп. 32. – Д. 41. – Л. 3.
3. Российский государственный архив социально-политической истории. – Фонд 159. – Оп. 2. – Д. 28. – Л. 12.
4. АВП РФ. – Фонд 04. – Оп. 32. – Папка 202. – Д. 34. – Л. 46–48.
5. Ladoś, A. Wasilewski w rokowaniach ryskich / A. Ladoś // Niepodległość. – 1937. – № 16. – S. 230 – 250.

Репозиторий ВГУ